**24.** Дадзены назоўнікі:

*1) адрасат; 2) адрасант; 3) паштальён; 4) абанент.*

Якое значэнне кожны з іх мае:

*а) той, хто піша; б) той, хто атрымлівае;*

*в) той, хто разносіць пошту па адрасах; г) той, хто мае тэлефон?*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-в, 4-г. **В)** 1-в, 2-б, 3-г, 4-а.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б. **Д)** 1-а, 2-в, 3-б, 4-г.

---

**25.** Для прыманьвання коней у народзе ўжываюцца словы … .

**А)** “це-це-це”. **Б)** “пыль-пыль-пыль”. **В)** “кось-кось-кось”.
**Г)** “дзю-дзю-дзю”. **Д)** “шут-шут-шут”.

---

**26.** Дадзены прыклады: *1) асені; 2) коны; 3) сярэбраны.*

Якія прыметнікі напісаны няправільна?

**А)** усе прыметнікі. **Б)** няма такіх прыметнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**27.** Колькі прыметнікаў ужыта ў сказе?

*На прасторах нашай краіны шумяць зялёныя лясы,*
*стужкамі ўюцца блакітныя рэкі, глядзяць у неба сінія азёры.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**28.** Якое слова-назва ягады прапушчана ў народным выслоўі?

*Не быць каліне … .*

**А)** чарніцаю. **Б)** ажынаю. **В)** малінаю. **Г)** брусніцаю. **Д)** суніцаю.

---

**29.** Дзеяслоў *любавацца* ў форме абвеснага ладу цяперашняга часу 2-ой асобы множнага ліку напішаце … .

**А)** любуіцеся. **Б)** любуяцеся. **В)** любуяцесь. **Г)** любуецеся. **Д)** любуецесь.

---

**30.** Хто з’яўляецца аўтарам вершаваных радкоў?

*Край паэм,*
*адвечных песень-казак –*
*дарагая сэрцу*
*Беларусь…*

**А)** Францішак Багушэвіч. **Б)** Паўлюк Трус. **В)** Максім Багдановіч.
**Г)** Янка Купала. **Д)** Якуб Колас.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
КОНКУРС
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 4. Тыраж 14050 экз. Мінск. 2026 г.

Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2026»

*Чацвер, 12 лютага 2026 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Колькі слоў у сказе?

*Ёнбыўлёгкінапад'ём.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**2.** Кавальскім рамяством займаецца … .

**А)** мастак. **Б)** бондар. **В)** разьбяр. **Г)** каваль. **Д)** плытагон.

---

**3.** Выберыце з дадзеных прыкладаў прыметы тэксту:

*1) звязнасць; 2) завершанасць; 3) паслядоўнасць.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма такіх прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**4.** Колькі словазлучэнняў у сказе?

*На дагледжаным полі добра расце жыта.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**5.** Які назоўнік прапушчаны ў народным выслоўі?

*Пад ляжачы камень і … не цячэ.*

**А)** раќа. **Б)** вада. **В)** сляза. **Г)** хваля. **Д)** скруха.

**6.** Вызначце з прапанаваных словы, у якіх літара ***я*** абазначае два гукі:

*1) мята; 2) фіялка; 3) лілея.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**7.** Якое слова прапушчана ў прыказцы?

*Калі хочаш хлеба мець, трэба … глядзець.*

**А)** сяброў. **Б)** тэлевізар. **В)** надвор’е. **Г)** зямліцу. **Д)** планшэт.

**8.** Дадзены сказы:

*1. Вучні сабраліся каля школы і пайшлі на экскурсію.*

*2. Алесь любіў збіраць баравікі і падасінавікі.*

*3. Сябры пачалі дапамагаць адзін аднаму.*

У якім сказе ёсць аднародныя выказнікі?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такога сказа. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

**9.** Якую літару неабходна ўставіць на месцы пропуску ў слове *..лён*, каб атрымалася назва дрэва з шырокімі фігурнымі лістамі?

**А)** х. **Б)** к. **В)** м. **Г)** ц. **Д)** ф.

**10.** Які займеннік напішаце на месцы пропуску ў сказе?

*“Ігнат, … пойдзеш з намі ў тэатр?” – спытала маці ў сына.*

**А)** я. **Б)** вы. **В)** ты. **Г)** мы. **Д)** ён.

**11.** Дадзены прыклады: *1) снег; 2) позні; 3) цвік.*

У якіх словах свісцячы зычны перад мяккім зычным вымаўляецца мякка?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

**12.** Якія літары неабходна ўставіць на месцы пропуску ў словах народнай загадкі?

*Без рук, без но.., а в..роты ра..чыняе.*

**А)** г, а, с. **Б)** г, о, с. **В)** х, а, с. **Г)** г, а, з. **Д)** г, а, ш.

**13.** Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае ў прыказцы слова?

*Рэшатам вады **не наносіш**.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** азначэннем.
**Г)** дапаўненнем. **Д)** акалічнасцю.

**14.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце мяккі знак **ь**?

*1) ляс..нік; 2) бул..ба; 3) лаз..няк; 4) іл..гота.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

**15.** Як называецца спартыўнае практыкаванне, пры якім бягун, астаючыся на месцы, робіць рухі, уласцівыя бегу:

*1) хадзьба на месцы; 2) марафонскі бег; 3) бег на месцы; 4) спрынтарскі бег*?

**А)** няма такой назвы. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**16.** Дадзены прыклады: *1) горад; 2) цеплыня; 3) крок.*

Выберыце канкрэтныя назоўнікі.

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**17.** Якія сцвярджэнні з прапанаваных правільныя:

*1) усе якасныя прыметнікі маюць кароткую форму;*

*2) словазлучэнні бываюць простыя і складаныя;*

*3) аднароднымі могуць быць галоўныя і даданыя члены сказа*?

**А)** усе сцвярджэнні. **Б)** няма такіх сцвярджэнняў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**18.** Дадзены сказ: ***Па-над*** *Нараччу белыя воблакі плывуць.*

Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае слова?

**А)** назоўнікам. **Б)** займеннікам. **В)** прыслоўем.
**Г)** прыназоўнікам. **Д)** злучнікам.

**19.** У якіх прыкладах з прапанаваных напішаце часціцу *не* разам:

*1) (не)пагадзь; 2) (не)спакой; 3) (не)дакладнасць*?

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма такіх прыкладаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

**20.** Выберыце правільна напісаныя словы:

*1) білецёр; 2) дзюшес; 3) цітр.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**21.** Якое ўстойлівае спалучэнне мае значэнне *'марна траціць час'*?

**А)** даць жару. **Б)** агарод гарадзіць. **В)** даць задні ход.
**Г)** папасці на кручок. **Д)** біць лынды.

**22.** Кажан – гэта … .

**А)** дзікая млекакормячая жывёліна, сямейства пустарогіх, якая водзіцца звычайна ў гарах.
**Б)** лятучая мыш.
**В)** даўнейшы беларускі калядны абрад.
**Г)** аднагадовая расліна сямейства гарбузовых з вялікімі салодкімі пладамі.
**Д)** паўзун з доўгім звілістым целам, без ног.

**23.** Як называецца яловы лес, а таксама ссечаныя яловыя лапы або дрэвы?

**А)** дуброва. **Б)** гай. **В)** сасняк. **Г)** ельнік. **Д)** гушчар.